ПАДЗЕЯ

# СВЯТА СЛОВА Ў ГОРАДЗЕ СОНЦА

**12 чэрвеня прадстаўнічая дэлегацыя Саюза пісьменнікаў Беларусі ўзяла ўдзел у XX Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2021». У насычанай праграме другога фестывальнага дня вершы на роднай мове прагучалі з вуснаў паэтаў з Брэсцкай, Магілёўскай, Гродзенскай абласцей, а таксама іх калег з Мінска і цэнтральнага рэгіёну.**

Удзел Саюза пісьменнікаў Беларусі ў фестывалі беларускай песні і паэзіі, які сёлета адбыўся ў Маладзечне ў юбілейны 20-ы раз, з'яўляецца традыцыйным. Сярод арганізатараў паездкі паэтаў з розных куткоў Беларусі на рэспубліканскае свята роднага слова Мінская абласная бібліятэка і Цэнтральная бібліятэка г. Маладзечна. Узначалілі пісьменніцкі дэсант вядомыя дзеячы культуры – першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса, журналіст Алена Стэльмах і старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, паэт Міхась Пазнякоў. Першым пунктам фестывальнай праграмы значылася наведванне філіяла Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы ў Вязынцы. На радзіме класіка айчыннай літаратуры гасцей сардэчна сустракалі хлебам-соллю ды народнымі песнямі-танцамі. Паэтычныя чытанні прайшлі ля помніка Песняру. Вядучы імпрэзы – беларускі паэт Міхась Казлоўскі (Маладзечна).







Выступіць і ўвогуле пабываць у гэтай сакральнай для кожнага беларуса мясціне – вялікі гонар. Ля помніка Янку Купалу ў Вязынцы рэгулярна ладзяцца святы роднага слова, творчыя фестывалі з літаратурнымі чытаннямі, з удзелам шматлікіх таленавітых гасцей. Сёлета з лірычных і патэтычных прысвячэнняў Я.Купале пачалася фестывальная праграма СПБ «Маладзечна-2021».




**Афіцыйнае прывітанне удзельнікам фестывалю ў Маладзечне ад раённых уладаў.**

З урачыстымі прамовамі і кранальнымі прысвячэннямі вобразу нашага славутага класіка, Песняра беларускай зямлі выступілі Алена Стэльмах, Міхась Пазнякоў, Віктар Шніп (Мінск), Міхась Казлоўскі (Маладзечна), а таксама беларуская паэтэса з Гродна Людміла Кебіч. Песню ўласнага сачынення на словы Янкі Купалы выканаў бард Віктар Мяцельскі (Мінск).



**Алена Стэльмах**



**Міхась Пазнякоў**



**Віктар Шніп**



**Міхась Казлоўскі**



**Людміла Кебіч**



**Віктар Мяцельскі**

Толькі пры дапамозе паэтычнай вобразнасці можна выказаць усё тое, што значыць для нас Купала. Вобраз паэта, які стаў прарокам, сімвалам беларускасці, дарагі сэрцу кожнага нашага земляка. У прамовах выступоўцаў неаднаразова прагучала думка пра тое, што для кожнага з нас, для беларускай нацыі ў цэлым творчая спадчына Песняра – бясцэнны дар, свяшчэнны бацькоўскі запавет захоўваць вернасць нацыянальным вытокам, грамадзянскаму сумленню, любові да роднага краю, да народнай душы, які мы абавязаны выканаць і перадаць будучым пакаленням. У чарговы раз пацвердзіўся тэзіс: Купала вучыць, натхняе, адухаўляе...







Затым адбыліся ўскладанне кветак да помніка паэту і экскурсія ў яго радавое гняздо, дзе зараз размяшчаецца Дом-музей.





























**Вось так сёння выглядае адна з духоўных крыніц кожнага беларуса**

Калі трапляеш у такое месца, пачынаеш усведамляць святасць нашай гістарычнай памяці, важнасць у любых умовах, ва ўсе часы быць годным нашага мінулага. Бо менавіта здольнасць чалавека, балансуючы паміж традыцыяй і сучаснасцю, знаходзіць свой твар, сваё месца пад сонцам, а місія ўсяго грамадства – займаць «свой пачэсны пасад між народамі» і называецца ўласна культурай, культурным кодам нацыі.

Асобна хочацца сказаць пра добразычлівую, дружалюбную атмасферу літаратурных сустрэч, якімі быў напоўнены гэты чэрвеньскі дзень. Намаганні арганізатараў паездкі, кіраўнікоў рэспубліканскага пісьменніцкага Саюза, прадстаўнікоў раённых уладаў, работнікаў Дома-музея

Янкі Купалы ў Вязынцы, супрацоўнікаў бібліятэк заслугоўваюць самай шчырай хвалы і самых цёплых слоў удзячнасці. Усё было вельмі шчыра, душэўна, пазітыўна, сапраўды па-беларуску, па-гаспадарску… Па-народнаму.









Зёлкавая гарбата і салодкі пачастунак па-Купалаўску




Людміла Кебіч і Алена Стэльмах



**Людміла Кебіч і Міхась Пазнякоў. Вязынка. Чэрвень, 2021.**




Маладзечна называюць Горадам сонца.
Пагадзіцеся – не без падстаў…
ПАРК ПЕРАМОГІ



Першым пунктам знаходжання дэлегацыі СПБ у фестывальным Маладзечне значыўся гарадскі Парк Перамогі, а мерапрыемствам пад нумарам 1 – ускладанне кветак да вечнага агню на Мемарыяльным комплексе памяці воінаў-вызваліцеляў горада. Акцыя была прысвечана 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны і прайшла з элементамі краязнаўча-гістарычнай экскурсіі. У ролі гіда выступіў закаханы ў свой горад маладзечанскі паэт Міхась Казлоўскі.






Мемарыяльны комплекс памяці воінаў-вызваліцеляў Маладзечна – гэта дзве бетонныя стэлы вышынёй 25 метраў, злучаныя ўверсе пяціканцовай зоркай і стужкай. Абеліск сімвалізуе садружнасць войскаў 3-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерала арміі І. В. Чарняхоўскага і партызанскіх брыгад імя Фрунзе і «За Савецкую Беларусь», якія 5 ліпеня 1944 года ў выніку жорсткіх баёў вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Да стэл, якія ўвасабляюць ідэю перамогі, вядуць дзве архітэктурныя сценкі з бронзавымі барэльефамі. На барэльефах адлюстраваны эпізоды баёў за горад. Шырокая лесвіца вядзе да вечнага агню. Комплекс адкрыты ў снежні 1982 года, скульптары І. Н. Глебаў і А. М. Заспіцкі, архітэктары Ю. І. Казакоў і Ю. Б. Белановіч.















У 14.00 у Зале ўрачыстасцяў гарадскога Палацу культуры прайшлі здымкі спецыяльнага выпуску літаратурнага ток-шоў «Суразмоўцы» (тэлеканал «Беларусь 3»). Заслужаны дзеяч культуры Беларусі, журналіст, паэт Навум Гальпяровіч і госці аўтарскага праекта – першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша і старшыня Беларускага саюза кампазітараў Алена Атрашкевіч пагутарылі аб фестывалі ў Маладзечне, адказалі на пытанні традыцыйнай анкеты праграмы, закранулі актуальныя праблемы развіцця беларускай літаратуры, ролю роднай мовы ў фарміраванні грамадскай самасвядомасці і культуры. Вядучы Н. Я. Гальпяровіч прыадчыніў некаторыя сакрэты працы над праектам, пазнаёміў аўдыторыю з калектывам яго стваральнікаў і анансаваў свой новы аўтарскі праект на тэлеканале «Беларусь 3».






Кульмінацыйным момантам удзелу СПБ у Нацыянальным фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2021» стала паэтычна-музычная гасцёўня пад назвай «Святло Радзімы. Радасць Перамогі». Удзельнікамі творчай імпрэзы ў малой зале Палацу культуры сталі члены СПБ, паэты Віктар Шніп, Уладзімір Мазго, Навум Гальпяровіч, Леанід Баргдановіч; літаратуразнаўца, паэт Валеры Максімовіч; аўтар і выканаўца песень Віктар Мяцельскі; паэтэса Іна Фралова (Мінск); паэты Ірына Карнавухава і Уладзімір Цанунін (Мінская вобласць); паэтэсы Таццяна Дземідовіч і Настасся Нарэйка (Брэсцкая вобласць); Жана Міус і Алена Беланожка (Магілёў); паэты Людміла Кебіч і Дзмітрый Радзівончык (Гродна); аўтар і выканаўца песень Генадзь Парыкін (Мінск); паэтэса Таццяна Атрошанка (Маладзечна). Вядучыя імпрэзы – першы намеснік старшыні СПБ, журналіст, паэтэса Алена Стэльмах і старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, паэт Міхась Пазнякоў. Падчас літаратурна-музычнай праграмы прагучалі творы сучаснай беларускай паэзіі шырокага тэматычнага дыяпазону. Але пераважалі матывы любові да роднага краю і народу Беларусі, напісаныя ў розныя гады. Прыхільнікі роднага літаратурнага слова

сустракалі выступленні гучнымі апладысментамі. Фестывальны Маладзечна адарыў паэтаў сваёй шчырай любоўю і цяплом неабыякавых сэрцаў.



**Вядучыя імпрэзы Алена Стэльмах і Міхась Пазнякоў**



**Уладзімір Мазго**




**Навум Гальпяровіч**





**Выступае бард Віктар Мяцельскі**



**Міхась Пазнякоў**



**Валеры Максімовіч**



Іна Фралова



Таццяна Атрошанка



Віктар Шніп



Леанід Багдановіч



Выступаюць Таццяна Дземідовіч і Настасся Нарэйка





Ля мікрафону Ірына Карнавухава і Уладзімір Цанунін





Паэтэсы з Магілёва Жана Міус і Алена Беланожка





Людміла Кебіч



Дзмітрый Радзівончык



Спявае Генадзь Парыкін







Пасля імпрэзы



Час развітвацца з фестывальным Горадам сонца. Падумалася: а што калі, гучныя, пафасныя словы «Радзіма», «мір», «праца», «натхненне», «мастацтва», якія даводзіцца сустракаць у падобных выпадках – не проста словы, не проста скалынанне паветра?.. Так, магчыма, некаторыя каментары-абагульненні да фотаілюстрацый перажытай падзеі выглядаюць банальнымі. Гэта тлумачыцца толькі тым, што наша літаратурнае жыццё адрозніваецца традыцыйнасцю, стабільнасцю. У адрозненне ад жыцця грамадскага і палітычнага, літаратурнаму свету Беларусі фактычна ўдалося пазбегнуць значнай турбулентнасці. І гэта добры знак. Што тычыцца матыву народнага адзінства, пад знакам якога ў Беларусі праходзіць 2021 год, арганізацыя, у назве якой на першым месцы стаіць слова «саюз», творчы калектыў, захоплены захаваннем і прымнажэннем культурнай спадчыны нашай Айчыны, іграюць у працэсе яднання, згуртавання народа адну з галоўных роляў. Нас пераконвае само жыццё: *САЮЗНАСЦЬ* – сумеснае існаванне чалавека і Слова, грамадскай думкі і мастацкага вобразу ў рэчышчы традыцыі ёсць адзіны правільны шлях наперад.

***ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА***

